РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зайко А.М., студ. гр. 301 ФТБКіСМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
ст. выкладчык

# ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ Ў ІШКАЛДЗІ (БАРАНАВІЦКІ Р-Н БРЭСЦКАЙ ВОБЛ.) ЯК ЛАКАЛЬНЫ КУЛЬТУРАЎТВАРАЛЬНЫ ЦЭНТР

Вёска Ішкалдзь Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. мае багатую мінуўшчыну, у якой пакінулі след многія значныя гістарычныя падзеі і асобы. Этымалогія тапоніма *Ішкалдзь* не высветлена да сённяшняга дня. Даследчыкамі адзначаецца толькі яго балцкая аснова з тыповаю для літоўскіх мястэчкаў прыстаўкаю *ish-*.

Ішкалдзь знаходзіцца на сумежжы такіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў як Цэнтральная Беларусь і Панямонне. Гэтыя жывапісныя мясціны акаляюць доўгая і звілістая рэчка Уша, штучнае возера і лясы. Невыпадковым з’яўляецца станаўленне Ішкалдзі як мястэчка ў мінулым: праз яго праходзілі шматлікія шляхі, у ім адбываліся мнагалюдныя, шырока вядомыя кірмашы.

Па пісьмовых крыніцах Ішкалдзь вядома як маёнтак або мястэчка з 1-ай паловы XI ст. З 1449г. вёска з’яўляецца шляхецкай маёмасцю. Яе ўладальнікамі былі: Кацярына Тэньчэнская, Радзівіл Пярун, а таксама роды Неміровічаў, Ільінічаў, Вінтгенштейнаў.

У 1472г. Мікалай Неміровіч заклаў ў Ішкалдзі касцёл Святой Тройцы. Гэта афіцыйна прынятая дата будаўніцтва, аднак у архіўных дакументах XVII ст. адзначаецца: хто і калі пабудаваў храм – невядома. У сучаснай навуцы гісторыю станаўлення касцёла прынята звязваць менавіта з імем Мікалая Неміровіча (Няміры) – старосты віцебскага, смаленскага, любельскага і мцэнскага, прадстаўніка старажытнага дваранскага роду (герб Ястрабец).

У завяшчанні, якое 02.02.1471 г. засведчыў віленскі біскуп Е. Валовіч, Мікалай Неміровіч аддаў сваю «сядзібу, з усім прыналежным дабром»

Ішкалдскаму касцёлу. У далейшым Троіцкі касцёл  неаднойчы атрымліваў значныя ахвяраванні і ад уладальнікаў ішкалдскай сядзібы, і ад іншых апекуноў у выглядзе зямлі, лесу, правоў на лоўлю рыбы ў бліжэйшых рэках і азёрах, грашовых сродкаў. Ці не значыць гэта, што храм ужо тады існаваў у мястэчку? Згадаем, што польскі даследчык Е. Ахманьскі (праўда, без спасылкі на крыніцы інфармацыі) называў датай будаўніцтва касцёла 1449 год. Ёсць некалькі версій адносна яго ўзнікнення: паводле адной з іх, храм быў пабудаваны на месцы язычніцкага капішча; у адпаведнасці з іншай – на месцы цяперашняга Троіцкага касцёла ўжо ў XII ст. узвышаўся каменны храм.

Паводле сваёй унікальнай планіроўкі  касцёл не мае прамых паралеляў сярод архітэктурных помнікаў Беларусі і Літвы. Ён нагадвае маленькую крэпасць, якая пры неабходнасці магла прытуліць усіх, хто шукаў у ёй паратунку. Рукапісныя крыніцы канца XVI – пачатку XVII ст. сведчаць, што Ішкалдскі касцёл першапачаткова быў абкружаны каменнай агароджай з брамаю і земляным валам – як і належыць па правілах абароны. Ён выкананы ў гатычным стылі і ўключае ў сябе элементы візантыйскай і раманскай архітэктуры. У адрозненне ад  архітэктурных помнікаў першай палавіны XVI ст., на франтоне касцёла нішы не ўтвараюць асобных ярусаў. Гэта, на думку спецыялістаў, пазбавіла храм статычнасці і надало яму маляўнічасці. Яго невялікі па памерах прамавугольны план (10х14,5), завяршае пяцісценная апсіда. Гатычныя элементы  праяўляюцца  ў зорчатых і крыжападобных скляпеннях, у высокім даху, у стрэльчатых аконных і дзвярных выемках, ва ўбранстве галоўнага фасада пляскатымі нішамі розных абрысаў і памераў.

Лёс гэтага збудавання XVI ст. трагічны і разам з тым тыповы для помнікаў культавага дойлідства Беларусі. У другой палове XVI ст. уладальнік мястэчка Мікалай Радзівіл Чорны (1515-1565), захапіўшыся ідэямі рэфарматарства, выкарыстаўшы свае сувязі і ўладу, перайшоў з каталіцызму ў кальвінізм. Ён навярнуў сваіх падданых да новай веры, а касцёлператварыў ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кальвініскі сабор. Але у 1641г. храм вяртаецца ва ўлонне каталіцкай царквы. Пасля у гады вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654—1667) быў часткова разбураны.

Пасля паўстання Кастуся Каліноўскага па загаду імператара Аляксандра II у 1866 г. у Ішкальдзі былі забароненыя рымска-каталіцкія набажэнствы, а ў 1868 г. у храме адбылося асвячэнне Свята-Троіцкай царквы. Гэта падзея адмоўна адбілася на аблiччы касцёла, асабліва на яго інтэр'еры, які быў пераабсталяваны паводле канонаў праваслаўнага абраду. Менавіта ў тыя гады, мяркуючы па звестках рукапісных крыніцаў, былі назаўсёды страчаны выдатныя творы іканапісу, скульптуры, прыкладнога мастацтва, якія раней знаходзіліся ў Троіцкім касцёле. У 1918 г. святыня вяртаецца каталікам.

З 1946 года, у сувязі з ад'ездам у Польшчу ксяндза Юзафа Курловіча, Ішкалдскі касцёл доўгі час не меў свайго святара – сюды прыязджалі ксяндзы са Сталовічаў і Нясвіжа.

Нарэшце ў 1956 г. парафію прыняў ксёндз Ежы Росяк (1914-1987гг.). Пра яго можна сказаць, што сваёй святарскай індывідуальнасцю ён быў для іншых выразным і ясным знакам і паказальнікам: ён ўсведамляў сваё святарскае пакліканне, меў глыбокую веру і адважна яе вызнаваў, упэўнена навучаў, служыў, быў духоўна блізкі сваім парафіянам. Ежы Росяка ўшаноўваюць ў Ішкалдзі і зараз і ставяцца да яго як да некананізаванага святога. На гэта ў значнай ступені паўплывала адважнае вызнанне ім хрысціянскай веры, а дакладней, 10 гадоў зняволення, якія ён адбыў у лагеры ў Нарыльску. Абвінавачванне святара было сфабрыкавана НКВД – распаўсюджане твораў (прыпевак) антысавецкага зместу. Да катаргі ў вязніцы на шматгадзінных допытах ён зведаў як фізічныя, так і псіхічныя мардаванні. Пасля лагера ўсё жыццё ксёндза Росяка было аддана самаахвярнай душпастырскай працы. Гэты знакаміты святар працаваў акрамя Ішкалдзі ў многіх парафіях: у Паланэчцы, Баранавічах, Новай Мышы, Навагрудку. Але яго дзейнасць у Троіцкім касцёле ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ішкалдзі была перапыненая ў 1969 г., у сувязі з рашэннем савецкай улады аб закрыцці касцёла.

Пасля гэта была спроба рабавання святыні. Аднак вернікі не далі вывезці касцёльную маёмасць і леглі пад колы машын, якія яе вывозілі.Тым самым яны захавалі тыя нямногія старажытныя рэліквіі, што і цяпер знаходзяцца ў храме. Толькі ў 1970 г. пад скляпеннямі касцёла аднавіліся богаслужэнні.

Прааналізаваўшы гістарычны шлях Троіцкага касцёла ў Ішкалдзі, трэба адзначыць што на працягу ўсёй яго гісторыі, жыхары мястэчка і ўсе парафіяне не былі па-за межамі падзей, звязаных з храмам, але наадварот прымалі непасрэдны ўдзел у яго жыцці. Калі запытвацца ў старажылаў Ішкалдзі пра этнаграфічныя ці фальклорныя звесткі, як бы там не было, яны звязваюць іх з каталіцкай верай, рэлігійнымі тэкстамі ці песнямі на польскай мове або касцёлам.

Вывучэнне традыцыйнай культуры насельнікаў в. Ішкальдзь паказвае, што ўплыў каталіцызму на яе вельмі істотны. Гэта выражаецца найперш у значнай колькасці хрысціянскіх элементаў у сямейных абрадах і звычаях. Каляндарныя абрады і жанры вусна-паэтычнай творчасці амаль цалкам прасякнуты каталіцкімі спевамі на польскай мове, малітвамі, зычэннямі і іншымі парэміялагічнымі формамі, у якіх фіксуецца вобраз Бога.

Амаль не бытуюць у гэтай лакальнай культуры вераванні ў прыродных духаў і дэманаў, духаў хаты і гаспадарчых пабудоў, Адзінае, у чым праяўляюцца міфа-паэтычныя рэлікты, — гэта ў элементах народнай педагогікі. Успамінаюць *Бабу-Ягу*, якая сядзіць ў калодзежы або лятае вечарам па вёсцы, *чорта*, што хаваецца ў жыце. Пры гэтым трэба адзначыць бытаванне павер'яў, звязаных з чарадзействам і магіяй, верай у народную медыцыну, знахарства. Відаць такую ўстойлівасць народнай медыцыны абумоўлівае яе накіраванасць на практычны, матэрыяльны, жыццёвы лад у большай ступені, чым на свядомасны, ментальны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разгляд лакальнай культуры насельнікаў вёскі Ішкалдзь дазваляе зрабіць наступныя вывады:

- Самы старажытны на тэрыторыі Беларусі каталіцкі храм – Касцёл Святой Тройцы ў в. Ішкалдзь – з’яўляецца значным лакальным культураўтаваральным цэнтрам. Гэтаму паспрыялі аб’ектыўныя гістарычныя умовы – геаграфічнае размяшчэнне і адміністрацыйная роля, якую адыгрывала мястэчка Ішкалдзь у XV – XVIII стст. Суб’ектыўным фактарам, які ўплываў на захаванне хрысціянскай традыцыі ў насельнікаў в. Ішкалдзь у савецкі час, з’яўляецца жыццё і дзейнасць мясцовага святара Ежы Росяка.
- Каляндарныя святы і прысвяткі ў традыцыях жыхароў в. Ішкалдзь характарызуюцца выразным уплывам духоўных традыцый каталіцызму. У сямейных абрадах і звычаях назіраецца цеснае перапляценне хрысціянскай і язычніцкай традыцыі, пры дамінаванні першай.
- У нязначнай колькасці маюць месца праяўленні дахрысціянскіх вераванняў: у некаторых рытуальных дзеяннях у кантэксце каляндарнай і сямейнай абраднасці, у бытаванні народнай медыцыны.

Літаратура:

1. "Каталіцкія храмы на Беларусі. Энцыклапедычны даведнік", Мн., "Беларуская энцыклапедыя", 2000 г, тыр. 3000.
2. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал. : А.А. Воінаў [і інш.]. - Мінск : "Беларуская Энцыклапедыя" імя П. Броўкі, 1993. - 620 с. : фат., іл.
3. Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. Т.1 (Дооктябрьский период). 3 изд. Мн., 1985.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Баравы Р. В. Невядомы помнік беларускай готыкі.//Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1987, № 2. С.20-24.

Габрусь Т. В. Мураваная сакральныя архітэктура Беларусі перыяду Вялікага княства Літаўскага да стварэння Рэчы Паспалітай (канец XIII — трэцяя чвэрць XVI ст.) Готыка і рэнесанс // Архітэктура Беларусі: Нарысы эвалюцыі ва ўсходне-славянскім і еўрапейскім кантэксце. Т1. Мінск, 2005. С.212—295.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ